# РАЗЬДЗЕЛ 4 Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў галіне стратэгічнай бясьпекі

Ян Мікалаеў

## ВАЙСКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ Й РАСІІ

Стасункі Беларусі з Расіяй у вайсковай сфэры лічацца пасьлядоўнымі й трывалымі з часоў набыцьця гэтымі абедзьвюма дзяржавамі незалежнасьці. Вайсковае супрацоўніцтва паміж імі не спынялася нават у першыя гады пасьля распаду СССР. Ужо ў ліпені 1992 году ў Маскве была падпісана беларуска-расійская Дамова аб каардынацыі дзейнасьці ў галіне абароны. Першая вайсковая дактрына сувэрэннай Беларусі, прынятая 16 сьнежня 1992 году, дэклявала бязьядравы статус дзяржавы, нэўтралітэт, адмову ад уступленьня ў вайсковыя блёкі й саюзы. Прытрымліваца нэўтраліту ў міжнародных стасунках Беларусі імкнулася і тагачаснае кіраўніцтва краіны. Старшыня Вярхоўнага Савету 12 скліканьня ў 1991—1994 гг. Станіслаў Шушкевіч асабіста выступаў нават супраць далучэньня Беларусі да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы краінаў СНД. Спадкаемец Шушкевіча на пасадзе сьпікера парлямэнту Мечыслаў Грыб, які да абраньня на пасаду сьпікера ўзначальваў Камісію Вярхоўнага Савету па пытаннях абароны і нацыянальнае бясьпекі, наадварот, быў прыхільнікам далучэньня Беларусі да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы.

Першы прэзыдэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка меў зусім своеасаблівы погляд на нацыянальныя інтарэсы краіны. Ад пачатку свайго кіраваньня ён выбраў курс на аднаўленьне цесных узаемаадносінаў з Расіяй, у тым ліку і ў вайсковай сфэры. Пра гэта сымбалічна сьведчыў ужо сам факт прызначэньня на пасаду міністра абароны Беларусі Анатоля Кастэнкі, які перад распадам СССР камандаваў Беларускай вайсковай акругай. У свой час генэрал-палкоўнік Кастэнка выступаў супраць стварэньня Ўзброеных Сілаў сувэрэннай Беларусі. На момант свайго прызначэньня ён нават ня меў беларускага грамадзянства. Генэрал Кастэнка на пасадзе міністра абароны асабліва ня рупіўся наладжваць цесныя стасункі з расійцамі, а больш дбаў пра ўласныя інтарэсы. У рэшце рэшт, дэ-факта за злоўжываньне службовым становішчам, Лукашэнка накіраваў Касьценку ў ганаровую ссылку за мяжу — прадстаўніком Беларусі ў штаб-кватэры НАТА.





Першая палавіна дзевяностых гадоў — час, калі беларускае войска перажывала моцны крызыс: афіцэрам плацілі мізэрныя заробкі, многія вайскоўцы ня мелі сталага жытла, раскрадалася вайсковая тэхніка й нават узбраеньні. Наша краіна не магла ўтрымліваць столькі жаўнераў, узбраеньняў і тэхнікі, колькі ўспадкавала ад Беларускай вайсковай акругі. У савецкі час на тэрыторыі Беларусі вайсковая група ўка налічвала больш за 240 тысячаў жаўнераў. Да 1996 году ўдалося скараціць асабовы склад беларускага войска да 85 тысячаў чалавек. Але й гэтай колькасьці жаўнераў для нашай краіны замнога. Паводле падлікаў спэцыялістаў, для Беларусі аптымальная колькасьць вайскоўцаў ня больш за 50 тысячаў чалавек, і тое пры ўмове, што эканоміка краіны будзе працаваць эфэктыўна.

У Расіі, дарэчы, таксама не было сродкаў на ўтрыманьне вялікага войска. Ад Савецкага Саюзу ёй дасталася ў спадчыну 3-мільённая армія. Яна пачала імкліва скарачацца. У кастрычніку 1994 году тагачасны расійскі прэзыдэнт Барыс Ельцын выдаў указ аб скарачэньні войска к студзеню 1995 году да 1,9 мільёну чалавек, а яшчэ праз год — да 1,7 мільёну чалавек, хоць першапачаткова плянавалася скараціць расійскае войска да 1,5 мільёну чалавек. Але на гэта не хапіла грошай, бо на сацыяльныя праграмы па адаптацыі афіцэраў і прапаршчыкаў патрэбна было значна больш сродкаў, чым на іх утрыманьне ў войску.

Літаральна за дзень да падпісаньня Дамовы аб утварэньні Супольнасьці Беларусі й Расіі, з 1 красавіка 1996 году войскі супрацьпаветранай абароны дзьвюх дзяржаваў заступілі на сумеснае баявое дзяжурства. Стварыць уласную сыстэму супрацьпаветранай абароны (далей СПА) на заходнім кірунку ў расійскага кіраўніцтва не было ні часу, ні сродкаў. А ў Беларусі ад Савецкай Арміі засталася сучасная сыстэма СПА. Расійскае кіраўніцтва надае вельмі важнае значэньне аб’яднаньню сыстэмаў СПА. Напрыклад, падчас НАТАўскіх бамбаваньняў Югаславіі Лукашэнка зьвярнуўся да Расіі з просьбай мадыфікаваць беларускую сыстэму СПА, і расійцы адгукнуліся на гэтую просьбу. У прыватнасьці, Расія мадэрнізавала зэнітна-ракетны комплекс “Бук”, які стаіць на ўзбраеньні ў беларускіх войскаў супрацьпаветранай абароны. Мадэрнізацыю праводзілі спэцыялісты Ўльянаўскага мэханічнага заводу. Пасьля мадэрнізацыі “Бук” можа зьнішчаць ня толькі самалёты стратэгічнай авіяцыі, верталёты і крылатыя ракеты, але й тактычныя балістычныя авіяцыйныя ракеты, элемэнты высокадакладнай зброі і нават наземныя аб’екты.

Для Расіі вайсковая інтэграцыя зь Беларусяй мае шэраг выгадаў. Найперш гэта беспасярэдні выхад на межы цэнтральна-эўрапейскага рэгіёну і стратэгічныя пэрспэктывы, якія гэты выхад адкрывае. Апрача гэтага, у аналітычным дакладзе, падрыхтаваным 19 красавіка 1997 году чальцамі Рады па замежнай і абароннай палітыцы для тагачаснага прэзыдэнта Расійскай Фэдэрацыі Барыса Ельцына, адзначалася, што для Расіі саюз зь Беларусяй дасьць “дадатковыя магутныя сродкі ўзьдзеяньня для разьвіцьця адносінаў з Украінай, нэўтралі-

зацыі магчымага пераўтварэньня Ўкраіны ў буфэрную антырасійскую дзяржаву, узмацненьне пазыцыяў для дыялёгу з Польшчай і краінамі Балтыі"*.

Аб'яднаньне зь Беларусяй, на думку кіраўніцтва расійскага міністэрства абароны, дазволіла б Расіі таксама павялічыць свае вайсковыя рэсурсы за кошт Узброеных Сілаў Беларусі.

Аднак і беларускае кіраўніцтва добра разумела, якія палітычныя і эканамічныя выгады яно будзе мець ад "здачы ў арэнду" Расіі стратэгічна важных аб'ектаў на тэрыторыі нашай краіны. Тым больш што беларускае войска, а таксама ваенна-прамысловы комплекс (далей ВПК) краіны вельмі цесна супрацоўнічаюць з Расіяй. Напрыклад, ВПК Беларусі амаль цалкам "завязаны" на кааперацыю з расійскай "абаронкай". 180 расійскіх абаронных прадпрыемстваў падтрымліваюць цесныя стасункі з 120 прадпрыемствамі беларускага ВПК. Звыш таго, у Беларусі існуе 15 навукова-дасьледчых інстытутаў, якія выконваюць вайсковыя распрацоўкі, у тым ліку на замову расійскага войска.

2 красавіка 1997 году на Найвышэйшай Радзе Супольнасьці Беларусі й Расіі былі зацьверджаныя "Агульныя прынцыпы вайсковага будаўніцтва й выкарыстаньне вайсковай інфраструктуры Беларусі й Расіі". Гэты дакумэнт вызначаў, у прыватнасьці, парадак фінансаваньня і выкананьня сумесных абарончых праграмаў. Аднак для яго рэалізацыі неабходна было падпісаць адпаведнае міждзяржаўнае пагадненьне. Такое пагадненьне было падпісанае 16 кастрычніка 1998 году. Яно таксама рэгулюе пытаньні сумеснага выкарыстаньня ў інтарэсах адзінай вайсковай групоўкі вайсковых аб'ектаў на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Згодна зь ім, Беларусь атрымала магчымасьць выкарыстоўваць для правядзеньня вучэньняў войскаў СПА расійскія палігоны, а расійскае войска атрымала прэфэрэнцыі ад беларускага кіраўніцтва на выкарыстаньне вайсковых аэрадромаў і іншай вайсковай інфраструктуры, што засталася ў нашай краіне ад Савецкай Арміі.

22 студзеня 1998 году была прынятая Канцэпцыя сумеснай абароннай палітыкі Беларусі й Расіі. Паводле гэтага дакумэнту, прадгледжвалася паглыбленае вайсковае супрацоўніцтва, стварэньне адзіных сыстэмаў супрацьпаветранай і проціракетнай абароны, фармаваньне ўзгодненага абароннага заказу. Ня ўсе палажэньні гэтага дакумэнту выкананыя й да гэтага часу. Напрыклад, адзіная сыстэма супрацьпаветранай абароны ня створаная, фінансаваньне адзінага абароннага заказу праваленае.

8 студзеня 1999 году ў Маскве было падпісанае пагадненьне аб стварэньні вайсковай беларуска-расійскай групоўкі колькасьцю каля 300 тысячаў жаўнераў, зь якіх каля 83 тысячаў маюць складаць беларускія вайскоўцы.

Зь беларускага боку ў рэгіянальную групоўку цалкам уваходзяць усе Ўзброеныя Сілы нашай краіны, з расійскага — войскі Маскоўскай ваеннай акругі і

* Гл. www.svop.ru/doklad02.htm





групоўка расійскага войска ў Калінінградзкай вобласьці.

У кастрычніку 2000 году на базе Акадэміі расійскага Генштабу прайшла каманднa-штабная гульня, падчас якой распрацоўвалася тактыка дзеяньняў рэгіянальнай групоўкі.

У цяперашні час расійскія вайсковыя вучэльні займаюцца падрыхтоўкай кіруючых кадраў Міністэрства абароны Беларусі. 125 беларускіх афіцэраў вучацца ў 16 расійскіх вайсковых вучэльнях, у тым ліку 14 — у Акадэміі Генштабу Ўзброеных Сілаў Расіі. Яшчэ 279 беларускіх хлопцаў ёсьць курсантамі расійскіх вайсковых вучэльняў.

## РАСІЙСКАЯ ВАЙСКОВАЯ ПРЫСУТНАСЬЦЬ НА БЕЛАРУСІ

Расію традыцыйна цікавіць вайсковая інфраструктура Беларусі, якая захавалася ад часоў СССР. Найперш гэта сродкі сувязі, кіраваньня войскамі, сродкі радыёвыведкі, а таксама аэрадромы ў Баранавічах, Мачулішчах, Шчучыне.

У савецкія часы Беларусь была самай мілітарызаванай рэспублікай СССР. Вайсковыя аб'екты ў Беларусі займалі каля 10% яе тэрыторыі, на іх месьцілася каля 5% усіх узброеных сілаў СССР. У нашай краіне разьмяшчалася больш за 1 тысячу тактычных ядравых ракетаў. Зь Беларусі ў савецкія часы ажыцьцяўлялася кіраваньне сіламі і сродкамі супрацьпаветранай абароны СССР, паколькі тут праходзіў другі эшалён абароны (першы быў на тэрыторыі колішняй ГДР і іншых эўрапейскіх краінаў Варшаўскага пакту).

Плянаў вяртаць у Беларусь ядравую зброю ў расійцаў пакуль няма, што неаднаразова падкрэсьлівалі кіраўнікі Расійскай Фэдэрацыі. Пры гэтым з моманту распаду СССР у Беларусі была зьнішчаная ўсяго адна з 81 шахты, прызначаных для пуску балістычных ракетаў, астатнія захаваліся і могуць пасьля рамонту выкарыстоўвацца для свайго першапачатковага прызначэньня.

Зрэшты, аднаўляць пляцоўкі для пуску ракетаў — справа вельмі дарагая і наўрад ці мэтазгодная. Куды прасьцей рэканструяваць беларускія аэрадромы перадавога базаваньня. Расійскія стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі, якія могуць несьці ядравую зброю, ужо неаднаразова зьдзяйсьнялі пасадку на беларускіх аэрадромах у Баранавічах і Мачулішчах. Для расійскай далёкай авіяцыі выкарыстаньне беларускіх аэрадромаў выгадна ня толькі са стратэгічнага, але й з матэрыяльна-рэсурснага пункту гледжаньня — больш за палову расійскіх вайсковых аэрадромаў знаходзіцца ў аварыйным стане.

Найважнейшым для Расіі вайсковым аб'ектам у Беларусі, несумненна, ёсьць радыёлякацыйная станцыя "Волга", разьмешчаная паблізу Ганцавічаў, за 48 кілямэтраў на паўднёвы ўсход ад Баранавічаў. Станцыю пачалі будаваць яшчэ ў 1982 годзе, бо менавіта зь яе дапамогай саветы меліся наладзіць кантроль за пускам балістычных ракетаў "Пэршынг-2", разьмешчаных у Заходняй Эўропе. У

1991 годзе будаўніцтва станцыі было спыненае кіраўніцтвам Беларусі, а ў 1993 годзе й увогуле “замарожанае”. Расійскаму кіраўніцтву тады было не да імпэрскіх амбіцыяў, бо паміж расійскімі элітамі адбываўся канфлікт. Тагачаснае ж кіраўніцтва Беларусі без энтузіязму ставілася да расійскай вайсковай прысутнасьці ў краіне.

Будаўніцтва станцыі РЛС “Волга” актывізавалася толькі пасьля першых прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. 6 студзеня 1995 году паміж Расіяй і Беларусяй было падпісана пагадненьне, паводле якога ўся рухомая і нерухомая маёмасьць станцыі, а таксама зямельны ўчастак былі перададзеныя расійскаму войску ў арэнду на 25 гадоў без спагнаньня ўсялякіх падаткаў. Больш за тое, Беларусь абавязалася не спаганяць плату за карыстаньне расійскімі вайскоўцамі каналамі сувязі.

Цяпер станцыя ўжо эксплюатуецца. Яе засяг улучае ня толькі наземную тэрыторыю Заходняй Эўропы, дзе разьмешчаныя балістычныя ракеты, але й раёны Паўночнай Атлянтыкі, у прыватнасьці тэрытарыяльныя воды Нарвэгіі, якія патрулююць амэрыканскія й брытанскія падводныя лодкі, узброеныя балістычнымі ракетамі “Трайдэнт”. Можна сказаць, што станцыя РЛС “Волга” замяніла падобны аб’ект у Скрундзе, які латвійскія ўлады не захацелі здаваць Расіі ў арэнду нават за 5 мільёнаў даляраў у год.

РЛС “Волга” знаходзіцца выключна ў расійскім падпарадкаваньні і абслугоўваецца расійскім пэрсаналам. Зьвесткі пра стан паветранай прасторы, якія атрымлівае станцыя, наўпрост накіроўваюцца расійскаму вайсковаму камандаваньню.

Другі важны расійскі аб’ект у Беларусі — вузел сувязі ваенна-марскога флёту. Ён разьмешчаны ў Вялейцы, займае тэрыторыю больш як 600 гектараў. Вышыня мачтаў амаль 300 мэтраў. Такіх станцыяў ува ўсім былым СССР было толькі пяць. Вялейская лічыцца адной з наймагутнейшых. Гэты аб’ект прызначаны для рэтрансьляцыі сыгналаў, якія паступаюць на расійскія караблі і субмарыны, што нясуць дзяжурства ў цэнтральнай і паўночнай частцы Атлянтычнага акіяну. Абслугоўваюць гэты вузел сувязі як расійскія маракі, так і беларускія вольнанаёмныя рабочыя, разам каля 400 чалавек. У 2000 годзе гэты аб’ект быў істотна мадэрнізаваны і ператвораны, у сутнасьці, у ключавое зьвяно ў ланцугу кіраваньня Расійскімі атамнымі падводнымі лодкамі стратэгічнага прызначэньня.

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ВАЙСКОВА-ПРАМЫСЛОВЫХ КОМПЛЕКСАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Як вядома, асноўныя прадпрыемствы вайскова-прамысловага комплексу Савецкага Саюзу, якія выраблялі канчатковую прадукцыю, знаходзіліся ў Расіі. У саюзных рэспубліках, у тым ліку і ў Беларусі, выраблялі пераважна толькі матэрыялы і камплектуючыя, а таксама спэцыяльнае абсталяваньне. Напрыклад, у Беларусі не было прадпрыемстваў па вырабе зброі й вайсковай тэхнікі, за выняткам хіба што Менскага заводу колавых цягачоў, які вырабляў цягачы для перасоўваньня ракетаў. Паводле стану на пачатак 1992 году ВПК Беларусі прыкладна на 20% забясьпечваў матэрыяламі і камплектуючымі расійскія прадпрыемствы ВПК. Аснову беларускага вайсковага экспарту ў Расію складалі пілятажныя сыстэмы, авіянавігацыйныя прылады, сродкі спадарожнікавай і касьмічнай сувязі, радыёстанцыі, антэнныя прыстасаваньні, станцыянарныя і бартавыя вылічальныя комплексы, сыстэмы аўтаматызацыі і праграмнага забесьпячэньня, оптыка-мэханічнае абсталяваньне, кантрольнае абсталяваньне для вытворчасьці звышвялікіх інтэгральных схемаў, вырабы хімічнай прамысловасьці, велікагрузныя колавыя шасі, прычэпы і паўпрычэпы для вайсковай аўтатэхнікі. Як відаць, “намэнклятура” даволі вялікая. Расійскае войска, у адрозьненьне ад Савецкай Арміі, не магло купляць такой вялікай колькасьці абсталяваньня, прыладаў і тэхнікі ў беларускага ВПК. Таму доля паставак зь Беларусі расійскаму ВПК па стане на 1 студзеня 1994 году скарацілася да 8%. Расійцы найперш адмовіліся ад паслугаў тых беларускіх прадпрыемстваў, якія дублявалі расійскія. Да таго ж, да 1994 году беларускі экспарт у Расію абкладаўся расійскімі мытамі, што рабіла менш канкурэнтаздольнай прадукцыю айчынных прадпрыемстваў ВПК. Дзеля таго каб ліквідаваць гэты цэнавы бар’ер, яшчэ ў 1994 годзе было падпісана міжурадавае беларуска-расійскае пагадненьне аб вытворчай і навукова-тэхнічнай каапэрацыі прадпрыемстваў абаронных галін прамысловасьці, а 28 красавіка 1999 году Лукашэнка і Ельцын зацьвердзілі канцэпцыю сумеснага абароннага заказу. Ён прадугледжвае ўзаемныя пастаўкі ўзбраеньня, тэхнікі, боепрыпасаў і камплектуючых матэрыялаў. У 2000 годзе ў рамках саюзнай дзяржавы была зацьверджаная праграма ўзгодненай мабілізацыйнай падрыхтоўкі на пэрыяд да 2005 году, распрацаваныя праекты праграмаў узбраеньня саюзнай дзяржавы да 2005 году.

Аднак на выкананьне гэтых плянаў няма грошай. Беларускія ўлады меркавалі, што ўсе гэтыя праграмы будуць фінансавацца з саюзнага бюджэту, асноўным донарам якога выступае Расія. Аднак саюзнага бюджэту стае толькі на фінансаваньне навукова-дасьледчай і выпрабавальна-канструктарскай дзейнасьці. А падрыхтоўка сэрыйнай вытворчасьці павінна ажыцьцяўляцца за кошт саміх прадпрыемстваў, а таксама за крэдытныя сродкі. Менавіта таму і ўзьнікла ідэя аб цеснай каапэрацыі прадпрыемстваў ВПК Беларусі й Расіі з прыцягненьнем банкаўскага капіталу. Інакш кажучы, прадпрыемствы беларускага й расійскага ВПК павінны самі шукаць грошы на вытворчасьць новых узораў узбраеньня й тэхнікі.

11 лютага 2000 году ў Менску была падпісаная міжурадавая дамова аб стварэньні беларуска-расійскай міждзяржаўнай фінансава-прамысловай групы “Абарончыя сыстэмы”. У склад гэтай МФПГ увайшлі 20 удзельнікаў, у тым ліку асноўныя распрацоўнікі і вытворцы вайсковай тэхнікі і ўзбраеньняў супрацьпавет-

ранай абароны, а таксама некаторыя фінансавыя ўстановы. У прыватнасьці, зь беларускага боку да "Абарончых сыстэмаў" далучыліся НВА "Інтэграл", Менскі завод колавых цягачоў, Барысаўскі прыладабудаўнічы завод, Авіярамонтны завод у Баранавічах, 140-ы танкарамонтны завод, АКБ "Менсккомплексбанк". Банкаўскія структуры далучаныя да МФПГ з мэтай яе апэратыўнага фінансаваньня.

Асноўны кірунак дзейнасьці МФПГ — распрацоўка, вытворчасьць, абслугоўваньне, рамонт і мадэрнізацыя ўзбраеньняў і тэхнікі супрацьпаветранай абароны. Найбольш значным праектам МФПГ зьяўляецца мадэрнізацыя зэнітна-ракетнага комплексу (ЗРК) С-125 "Пячора". Цікавасьць да мадэрнізаванай "Пячоры" выяўляюць найперш краіны Блізкага Ўсходу, якія маюць адмысловыя ЗРК, выробленыя яшчэ падчас існаваньня СССР. У пэрыяд з 1972 па 1986 год Савецкім Саюзам было пастаўлена каля 400 (а паводле некаторых падлікаў, каля 600) ракетных комплексаў "Пячора" ў 35 краінаў сьвету.

Другі буйны праект у галіне вытворчасьці ўзбраеньняў — стварэньне МФПГ "Аэракасьмічнае абсталяваньне". Пагадненьне аб стварэньні гэтай МФПГ было падпісана 2 красавіка 2001 году на паседжаньні Найвышэйшай Рады Саюзу Беларусі й Расіі ў Крамлі. Дамінуюць у ім расійскія прадпрыемствы. Зь беларускага боку ў праекце дзейнічаюць пакуль толькі 2 удзельнікі — Барысаўскае вытворчае аб'яднаньне "Экран" і Івацэвіцкі прыладабудаўнічы завод.

Трэба адзначыць, што беларускі ВПК ня можа пакуль на роўных супрацоўнічаць з расійскім ВПК, бо ня мае магчымасьці выпускаць гатовую прадукцыю.

Выняткам тут хіба толькі менскае прадпрыемства "Мінатор-сэрвіс", якое актыўна супрацоўнічае з шэрагам расійскіх абарончых фірмаў. Прадпрыемства займаецца мадэрнізацыяй вядомай зэнітнай самаходнай устаноўкі "Шылка" і гусенічнага плаваючага бронетранспарцёра БТР-50.

"Мінатор-сэрвіс" разам з расійскімі канструктарамі стварылі таксама ўнікальную выведна-дывэрсійную машыну 2Т.

Плянуецца рэалізаваць таксама беларуска-расійскі праект сумеснай зборкі баявых самалётаў СУ-27 у на базе авіярамонтнага заводу ў Баранавічах, а таксама вытворчасьць танкаў і самаходных установак на базе беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Напрыклад, беларускае міністэрства абароны хацела б асвоіць выпуск дэталяў для танка Т-72, а таксама набыць у Расіі хаця б некалькі сучасных танкаў Т-90С. Бо ўжо празь некалькі гадоў узбраеньне й тэхніка, якія засталіся ў спадчыну ад Беларускай вайсковай акругі, канчаткова састарэюць. А пераўзброіць войска нават тэхнікай расійскай вытворчасьці коштам беларускага бюджэту пакуль нерэальна. Дагэтуль Беларусь самастойна здолела толькі мадэрнізаваць сыстэму залпавага агню "Град", якая мае цяпер назоў "БелГрад". У адрозьненьне ад расійскага аналягу "БелГрад" мае шасі аўтамабілю МАЗ. На 140-м танкарамонтным заводзе ў Барысаве выраблены некалькі ўзораў баявых машын "Кобра". Дакладней, гэта мадэрнізаваныя савецкія БМП і БТР. На ўзбраеньне ў беларускае войска яны дагэтуль не паступілі, праходзяць выпрабаваньні. Адна зь нешматлікіх распрацовак беларускага ВПК, якая цяпер паступае на ўзбраеньне айчынных Узброеных Сілаў, — прыцэлы для стралковай зброі вытворчасьці Беларускага оптыка-мэханічнага аб'яднаньня (БелОМА).

Зрэшты, і сама Расія ня можа ўзброіць сваё войска сучаснай тэхнікай уласнай вытворчасьці. Расійскі ВПК цяпер вучыцца сам зарабляць грошы і таму арыентуецца на экспарт узбраеньняў. Асноўныя пакупнікі расійскай вайсковай тэхнікі і зброі — Кітай і Індыя. Летась Расія атрымала ад продажу зброі за мяжу амаль 5 мільярдаў даляраў. Колькі грошай ад продажу зброі атрымлівае Беларусь — вялікі сакрэт. Вядома толькі, што ўсе грошы ад продажу зброі трапляюць у спэцыяльныя фонды Лукашэнкі, які асабіста імі й распараджаецца. Заходнія аналітычныя службы цьвердзяць, што Беларусь вельмі актыўна гандлюе зброяй і ўваходзіць нават у першую дзясятку экспарцёраў зброі ў сьвеце. Дагэтуль беларускія ўлады не называлі дакладнай сумы грошай, атрыманых ад продажу зброі.

У Беларусі гандлем зброяй займаюцца толькі 4 спэцыялізаваныя прадпрыемствы: "Белспэцзамежтэхніка", "Белтэхэкспарт", "Белзамежпрамсэрвіс" і "Беларусзамежгандаль". Паводле афіцыйных зьвестак, Беларусь экспартуе толькі вайсковую тэхніку і зброю, якая была раней ува ўжытку. Кантроль за экспартам-імпартам зброі ажыцьцяўляе Міжведамасная камісія па ваеннатэхнічным супрацоўніцтве і экспартным кантролі пры Радзе бясьпекі. Беларускія ўлады абвяргаюць зьвесткі аб тым, што наша краіна пастаўляла зброю тэрарыстычным арганізацыям. Разам з тым, першы намесьнік старшыні КДБ Сьцяпан Сухарэнка 13 сакавіка 2002 году падчас прэсавай канфэрэнцыі ў Менску пацьвердзіў, што Беларусь пастаўляе вайсковую тэхніку і ўзбраеньне ў Альжыр, Анголу і Судан. Увогуле, наша краіна супрацоўнічае ў вайсковай сфэры з 30 дзяржавамі сьвету, але ўсё гэтае супрацоўніцтва тычыцца распродажу вайсковых скарбаў СССР.

Спробы беларусаў самастойна выйсьці на міжнародны зброевы рынак з новымі ўзорамі баявой тэхнікі ня мелі посьпеху. Летась у Менску была наладжаная нават спэцыяльная міжнародная выстава "Менскі салён абароннай прамысловасьці-2001" (скарочаная назва MILEX-2001). Паводле задумы арганізатараў, меркавалася, што гэтая выстава, у якой бралі ўдзел прадстаўнікі больш як 100 краінаў сьвету, дасьць выгадныя кантракты беларускаму ВПК. Беларускія й расійскія вытворцы зброі й сапраўды прадставілі на выставе найбольшую колькасьць узораў зброі й тэхнікі. Аднак падчас выставы беларускім вытворцам удалося падпісаць толькі адну дамову на пастаўку зброі: прадпрыемства "Мінатор-сэрвіс" дамовілася пастаўляць у Эгіпэт вайсковую тэхніку — мадэрнізаваныя бронетранспарцёры БТР-50 і зэнітную ўстаноўку "Шылка". А вось для новай выведна-дывэрсійнай машыны 2Т, якая за сваё магутнае ўзбраеньне і здольнасьць незаўважна "падкрасьціся" да праціўніка атрымала назву "Сталкер", "Мінатор-сэрвіс" да гэтага часу не знайшоў пакупнікоў, хоць яна ўжо двойчы

выстаўлялася на выставе вайсковай тэхнікі ў Абу-Дабі. Гэтая машына вельмі дарагая, але невядома, наколькі яна надзейная. Звычайна замежнікі набываюць толькі тую тэхніку, якая ўжо прайшла выпрабаваньне ўва ўзброеных сілах краіны-вытворцы. Але беларускаму войску “Сталкер” не па кішэні. Расійскае ж міністэрства абароны, хоць і мае большыя фінансавыя магчымасьці, чым беларускія вайскоўцы, не сьпяшаецца набываць “цуд” беларускай інжынэрнай думкі.

Беларускія прадпрыемствы ВПК часам вядуць канкурэнтную барацьбу з расійскімі калегамі за цікавыя замовы. Напрыклад, сёлета Баранавіцкі авіярамонтны завод змагаўся з расійскай самалётабудаўнічай карпарацыяй “МіГ” за права рамантаваць і мадэрнізаваць 20 зьнішчальнікаў МіГ-29 баўгарскай арміі. Баўгары аддалі перавагу расійцам. Галоўнай прычынай паразы беларусаў у гэтым тэндэры, на думку назіральнікаў, быў той факт, што баранавіцкія авіярамонтнікі ня маюць генэральнай ліцэнзіі на рамонт МіГаў. Адметна, што адпаведны сэртыфікат выдае акурат згадае канструктарскае бюро “МіГ”, якое і стала пераможцам “баўгарскага” тэндэру.

Гэта сьведчыць пра тое, што расійскі ВПК супрацоўнічае і будзе надалей супрацоўнічаць зь беларускімі партнэрамі толькі ў тых выпадках, калі гэта прыносіць яму выгаду. І такая тэндэнцыя будзе ўзмацняцца, бо расійскае кіраўніцтва мае намер правесьці далейшую прыватызацыю прадпрыемстваў ВПК.

## ПЭРСПЭКТЫВЫ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ Ў ВАЙСКОВАЙ СФЭРЫ

Асноўным кірункам вайсковага супрацоўніцтва Беларусі й Расіі ў найбліжэйшы час будзе фармаваньне нарматыўна-прававой базы. Сярод іншага плянуецца прыняць вайсковую дактрыну саюзнай дзяржавы, у якой будуць апісаныя вайскова-палітычныя, вайскова-стратэгічныя і вайскова-эканамічныя асновы інтэграцыі. Можна чакаць таксама дапрацоўкі сумеснай праграмы ўзбраеньняў і адзінага абароннага заказу, таму што беларускаму кіраўніцтву вельмі хочацца пераўзброіць войска з дапамогай Расіі. Плянуецца таксама прыняць палажэньне аб правядзеньні сумесных навукова-дасьледчых работ у інтарэсах міністэрстваў абароны Беларусі й Расіі. Для беларускіх НДІ гэта дало б вельмі выгадныя заказы.

Што датычыць аб’яднаньня беларускага й расійскага войскаў, то іх зьліцьця найбліжэйшым часам чакаць не выпадае. Рэгіянальная групоўка, адзіная сыстэма супрацьпаветранай абароны будуць існаваць толькі на паперы. Рэальна ж у найбліжэйшы час беларуская і расійская часткі гэтых груповак будуць знаходзіцца пад камандаваньнем толькі сваіх міністэрстваў абароны. І адно ў далёкай пэрспэктыве плянуецца стварыць штаб аб’яднаных узброеных сілаў дзяржаваўудзельніцаў Саюзу Беларусі і Расіі. Пры гэтым расійскае кіраўніцтва пакуль не гатовае перадаваць такую важную функцыю, як камандаваньне ўзброенымі





сіламі, у кампэтэнцыю саюзных органаў, хоць Лукашэнка яшчэ ў 1997 годзе заяўляў, што гатовы пайсьці ў вайсковай інтэграцыі нават на стварэньне наднацыянальных органаў кіраваньня войскамі. А колішні міністар абароны Беларусі Аляксандар Чумакоў у 1999 годзе падчас сумеснай калегіі з кіраўніцтвам Узброеных Сілаў Расіі неаднаразова падкрэсьліваў, што Расія можа лічыць нашу армію Беларускай вайсковай акругай.